

Ці можам існаваць мы без прыроды?
Ці можам жыць мы без яе?

Ці ў светлае, ці ў хмурнае надвор’е
Павінны мы заўжды любіць яе!

*А. Шаплыка.*



# КЛОПАТ ПРА ТЫХ, ХТО НАВОКАЛ







Не праганяйце кошак і сабак,
Калі яны прыйшлі да вас у госці.
Яны ў кожнай хаце — добры знак,
Яны прыносяць радаснае штосьці.

*Іван Муравейка.*

Па́церкі — *рус.*: бусы.

Разгледзьце малюнак. Хто нагадвае пацеркі?

## Пацеркі на снезе

*Фама Рамашка*

Дзядуля тузануў лейцы. Конь спыніўся.

— Сяда́й, унучка, паедзем па сена.

Стажок стаяў за вёскай, на ўзле́ссі. Любачка згада́ла, як улетку тут красавалі кветкі, гойдалася на ветрыку высокая трава. А цяпер усё наўкола засыпана снегам. Стажок — бы вялікая снежная шапка.

Дзядуля скінуў са стажка снег. Узяў у рукі вілы. Неўзабаве ўсё сена ляжала на санях. Прые́мна пахла сушанай травой.

— Ну вось, унучка, паехалі дадому, — сказаў дзядуля і ўзяў у рукі лейцы.

— Пачака́й! — усклікнула Любачка.

На бялюткім снезе дзяўчынка заўважыла чырвоныя кропелькі. Нібы маміны пацеркі. Якое дзіва!

— Божыя кароўкі ў стажку перазімавалі, — сказаў дзядуля. — А цяпер могуць загі́нуць.



Шкада стала іх Любачцы. Улетку яна часта брала божых каровак на далоньку і пыталася: «Ці дождж, ці сонца? Калі дождж — сядзі, калі сонейка — ляці». Што ж рабіць? Дзядуля дастаў з кішэні кажуха карабок ад запалак. Любачка пакла́ла ў яго сухія лісточкі і давай хутчэй збіраць божых каровак.

На дварэ гуляюць завірухі, а божыя кароўкі спакойна спяць у карабочку. Пры́йдзе



вясна, вы́несе Любачка карабок з сенцаў і выпусціць іх. І зноў яны будуць прадказваць дзяўчынцы надвор’е.

1. Чаму Любачцы стала шкада божых каровак? Як яна вырашыла іх выратаваць? Знайдзіце і прачытайце.

2. Якую заклічку ўспомніла дзяўчынка, калі ўбачыла божых каровак? Прыгадайце заклічку пра слімака.
3. На што быў падобны стажок? Што нагадвалі чырвоныя крапелькі на снезе?
4. Перакажыце твор па апорных словах: *паедзем па сена, улетку, снежная шапка, сена на санях, чырвоныя крапелькі, у стажкý перазімавалі, стала шкада, брала на далоньку, дастаў карабок, давай хутчэй збіраць, спяць у карабочку, прыйдзе вясна, выпусціць, будуць прадказваць*.

Прачытайце народныя прыкметы. Замест малюнкаў называйце патрэбныя словы.

- Многа  — многа , многа  — многа .
-  цярэбяцца — будзе пацяпленне.
- Раніцай  вылятаюць з вулля — на пагодлівы дзень.
-  качаецца — да адлігі, снегу.

**Ла́зня** — *рус.*: баня.
**Гу́рбы** — снегавыя намёты.
**Пу́ня** — будыніна для захоўвання сена.

Прачытайце загаловак. Разгледзьце малюнак. Як вы думаеце, што здарылася зімой?

# Венікі

*Васіль Хомчанка*

Пеця навяза́ў бярозавых венікаў на зіму, каб парыцца ў лазні, і павесіў іх пад страхой пуні.

«Хопіць нам на ўсю зіму», — цешыўся ён.



Прыйшла зіма, халодная і вельмі снежная, надзьмула высокія гурбы. Яблыні ў садзе па голле патанулі ў снезе. А каля пуні, дзе віселі венікі, гурба даставала да самай страхі́.

Аднойчы выйшаў Пеця на агарод узяць венік і ледзь не заплакаў.

Ад венікаў адны агры́зкі засталі́ся. Усе венікі з'елі казулі ды зайцы. Толькі сляды свае пакінулі. Не адну, відаць, ноч звяры прыходзілі карміцца.

Пеця прывёў бацьку да пуні, паказаў:

— Во, усе венікі з'елі.

— З'елі і дзякуй сказалі.

— Каму?

— Табе. Падкарміў іх у суровую зіму, выручыў.

Наступным летам Пеця з сябрамі нарыхтаваў венікаў і звярам. Розных: бярозавых, асінавых, лазовых. А бацька стажок сена паставіў. Калі ласка, звяры, прыходзьце карміцца, толькі нашых венікаў не чапайце.

Звяры і прыходзілі. Нават察 лася бачылі, скуб сена са стажка.

1. Навошта Пеця навязаў бярозавых венікаў на зіму? Якая думка цешыла яго?
2. Чаму ад венікаў засталіся адны агрызкі? Знайдзіце адказ у тэксце.

3. Прачытайце па ролях размову Пеці з бацькам. Які настрой быў у хлопчыка? Чаму? Як змяняецца настрой хлопчыка ў час размовы? Якія словы бацькі гэтаму паспрыялі?
4. Раскажыце, што адбылося наступным летам.
5. Перакажыце тэкст у групах па апорных словах: *навязаў, павесіў, хопіць; зіма, гурбы, да страхі; ледзь не заплакаў, агрызкі, звяры; прывёў бацьку, дзякуй сказалі, падкарміў; нарыхтаваў, стажок, калі ласка, звяры.*

Прыдумайце па малюнку апавяданне пра тое, як людзі дапамагаюць жывёлам зімой.



Словы і выразы для выкарыстання: наст пасля адлігі, не могуць знайсці корму, леснікі, сена на санях, смачны пачастунак, хутка ўбачылі.